Дэпартамент па архівах і справаводству
Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі

# «АБРЫСЫ РОЗНЫЯ»
# Малюнкі і чарцяжы гетмана Януша Радзівіла

Мінск
«Беларусь»
2020

УДК 741/744(476)(092)+929Радзівіл
ББК 85.143(4Беи)
А16

Рэкамендавана да друку Вучоным саветам
Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі

Укладальнік:
*М. А. Волкаў*

Аўтары тэксту:
*М. А. Волкаў, К. І. Карлюк*

Рэцэнзенты:
доктар габілітаваны *К. Бабятынскі*
кандыдат гістарычных навук *В. С. Пазднякоў*

Праца выканана ў рамках планавай навуковай тэмы
Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі
«Іканаграфічныя матэрыялы ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі»

*Выпуск выдання ажыццёўлены па заказе і пры фінансавай падтрымцы*
*Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь*

**«Абрысы розныя»** : малюнкі і чарцяжы гетмана Януша Радзівіла / уклад. М. А. Волкаў ;
А16 аўт. тэксту : М. А. Волкаў, К. І. Карлюк. — Мінск : Беларусь, 2020. — 160 с., [40] л. іл.
ISBN 978-985-01-1396-2.

«Абрысы розныя» – гэта назва калекцыі ўласнаручных малюнкаў і чарцяжоў гетмана Януша Радзівіла, якая з'яўляецца ўнікальным зборам і не мае блізкіх аналагаў ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне. На іх адлюстравана вялікая колькасць будынкаў і краявіды цэлых гарадоў усходніх земель Беларусі і Украіны, якія значна пацярпелі або былі цалкам знішчаны ў час вайны 1654–1667 гг. Разам з тым, гэты збор ўяўляе сабой зафіксаваныя на паперы роздумы і назіранні іх аўтара, які з'яўляецца адной з самых цікавых і супярэчлівых асоб у гісторыі Рэчы Паспалітай XVII ст. У кнізе апублікаваны малюнкі гетмана з Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі і Расійскай нацыянальнай бібліятэкі, зроблена іх атрыбуцыя, прааналізавана тэматыка выяў і асобных сюжэтаў, а таксама кантэкст іх стварэння.

Кніга разлічана на даследчыкаў, выкладчыкаў, студэнтаў і ўсіх тых, хто цікавіцца гісторыяй і культурай Вялікага Княства Літоўскага.

**УДК 741/744(476)(092)+929Радзівіл**
**ББК 85.143(4Беи)**

**ISBN 978-985-01-1396-2**

© ДУ «Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі», 2020
© Афармленне. РУП «Выдавецтва «Беларусь», 2020

# Змест

Прадмова . . . . . . . . . . 5

ГІСТОРЫЯ МАЛЮНКАЎ І ІХ ВЫВУЧЭННЕ . . . . . . . . . . 9

АТРЫБУЦЫЯ МАЛЮНКАЎ ПА ЗНЕШНІХ ПРЫКМЕТАХ . . . . . . . . . . 15
- Філіграні . . . . . . . . . . 15
- Фармат паперы, характар малявання і почырк . . . . . . . . . . 22

МЯСЦІНЫ І ТЭМАТЫКА . . . . . . . . . . 32
- Барысаў: замак, іканастас і печ . . . . . . . . . . 32
- Любча: мястэчка . . . . . . . . . . 35
- Свіслач: замак і мястэчка . . . . . . . . . . 37
- Слуцк: горад і царква . . . . . . . . . . 39
- Дурынічы і Янава Салтанава Слабада: брама і царква . . . . . . . . . . 41
- Свядасць і Рось: палацы . . . . . . . . . . 43
- Ратуша . . . . . . . . . . 48
- Астражанка і Ражанка: касцельныя брама і купал . . . . . . . . . . 50
- Супрасль: фундацыйныя табліцы . . . . . . . . . . 51
- Кіеў: горад, царква, званіца, званы і зброя . . . . . . . . . . 52
- Межыгоры, Бышаў і Макараў: цэрквы і мястэчка . . . . . . . . . . 58
- Горваль і Германаўка: ваенныя лагеры . . . . . . . . . . 60
- Трафейныя харугвы . . . . . . . . . . 65
- Галоўчын, Копысь, Менск, Магілёў і Шклоў: спісы будынкаў . . . . . . . . . . 67
- Алыка, Дубна, Жоўква, Замосце і Сакаль: планы фартэцый . . . . . . . . . . 68
- Гарматы . . . . . . . . . . 68
- Варшава: печ . . . . . . . . . . 69

МАЛЮНКІ ЯНУША РАДЗІВІЛА Ў КАНТЭКСЦЕ ЭПОХІ . . . . . . . . . . 74
- Збіранне і захаванне накідаў і малюнкаў . . . . . . . . . . 77
- Выбар носьбітаў і сродкаў для стварэння малюнкаў . . . . . . . . . . 80
- Малявальшчык, інтэлектуал, мецэнат . . . . . . . . . . 82
- Асаблівасці стварэння «абрысаў розных» і праблемы інтэрпрэтацыі . . . . . . . . . . 86

Заключэнне . . . . . . . . . . 95

Каментарыі да малюнкаў . . . . . . . . . . 97

Ітынерарый Януша Радзівіла . . . . . . . . . . 142

Спіс скарачэнняў і абрэвіятур . . . . . . . . . . 152

Крыніцы і літаратура . . . . . . . . . . 153

Партрэт Я. Радзівіла. Д. Шульц, 1652 г.
Muzeum Narodowe w Gdańsku




Партрэт Я. Радзівіла. Д. Шульц, 1652 г.
Muzeum Narodowe w Gdańsku

# Прадмова

Развіццё навукі і тэхналогій прыводзіць да няўхільных змен культурнага ландшафту. Рэчы і з'явы, якія калісьці лічыліся звыклымі, праз пэўны час замяняюцца іншымі альбо знікаюць цалкам. Таму рэканструяваць мінулае надзвычай складана. Часцей за ўсё мы маем справу не проста з аддаленымі ў часе падзеямі, а дакранаемся да цалкам іншага сусвету. Паспрабаваць скласці па кавалачках карціну мінулага дапамагаюць гістарычныя крыніцы, якія могуць быць пісьмовымі, рэчавымі ці візуальнымі. Апошнія з'яўляюцца бадай самымі прыцягальнымі і адначасова ці не найскладанейшымі для інтэрпрэтацый даследчыкамі. На малюнках, планах і чарцяжах можна пабачыць, як выглядалі паселішчы, будынкі, увесь матэрыяльны свет людзей мінулага.

Да цяперашняга часу шмат цікавых іканаграфічных крыніц, што захоўваюцца ў архівах, застаюцца невядомымі. Напрыклад, адносна нядаўна ў Музеі Польскага войска ў Варшаве была выяўлена калекцыя копій малюнкаў XVI–XVIII стст. з архіва Радзівілаў, якія маюць вялікую каштоўнасць для вывучэння гісторыі Беларусі[1]. Не менш цікавым з'яўляецца знойдзены ў 2012 г. у Страгоўскім манастыры ў Празе нямецкамоўны рукапіс «Рэляцыя літоўскага паходу 1651 года», у якім апісанне выправы арміі Вялікага Княства Літоўскага на Кіеў суправаджаецца больш за дзясяткам цікавых чарцяжоў і планаў[2]. На жаль, да цяперашняга часу пражскі рукапіс і большая частка малюнкаў з варшаўскага музея не апублікаваны і не ўведзены ў навуковы ўжытак. Гэта тлумачыцца шмат у чым складанасцю дакладнай атрыбуцыі і апісання такога кшталту крыніц.

Вялікая прывабнасць іканаграфічных крыніц падштурхнула супрацоўнікаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі правесці мэтанакіраванае выяўленне іх ва ўласных зборах. Была распачата распрацоўка спецыяльнай планавай навуковай тэмы па выяўленні, атрыбуцыі і публікацыі іканаграфічных крыніц у фондах архіва. Асаблівую ўвагу прыцягнуў надзвычай цікавы збор чарнавых малюнкаў сярэдзіны XVII ст. Пра яго існаванне даследчыкам было вядома яшчэ з 1970-х гг., аднак да цяперашняга часу гэты збор нідзе цалкам не публікаваўся. Да нядаўняга часу заставалася няясна, хто быў яго аўтарам, і навошта ствараліся гэтыя накіды. Аднак шматпланавасць і вялікая колькасць сюжэтаў, адлюстраваных на малюнках, сведчаць пра значную каштоўнасць гэтага збору. Таму архівам было прынята рашэнне падрыхтаваць яго да публікацыі.

Калекцыя накідаў знаходзіцца ў фондзе 694 «Радзівілы, князі», сфарміраваным на аснове дакументаў з нясвіжскага архіва Радзівілаў[3]. У зборы налічваецца 46 пранумараваных аркушаў, на большасці выявы і надпісы нанесены з двух бакоў. Цалкам дамінуе архітэктурная тэматыка. Пры гэтым пераважаюць чарцяжы фасадаў і планы будынкаў, маюцца віды і планы гарадоў, а таксама спісы будынкаў у некалькіх паселішчах. Асобна вылучаюцца накіды

вайсковай і рэлігійнай тэматыкі: планы ваенных лагераў, спісы і малюнкі вайсковага рыштунку і царкоўных рэчаў. Абсалютная большасць малюнкаў з'яўляецца чарнавікамі, якія рабіліся хутка на месцы. Некаторыя выявы былі выкананы «начыста», прычым для чыставога варыянта выкарыстоўваліся зробленыя перад гэтым эскізы. Аўтар гэтых малюнкаў, відавочна, імкнуўся зафіксаваць цікавыя збудаванні і рэчы, якія ён бачыў у розных месцах. Такім чынам, мы маем справу са своеасаблівымі падарожнымі графічнымі нататкамі.

Чарнавыя малюнкі з архіва Радзівілаў вядомы даследчыкам без малога паўстагоддзя, аднак уяўленні пра гэты збор і яго значэнне для вывучэння матэрыяльнай культуры і гісторыі нашых зямель у сярэдзіне XVII ст. заставаліся цьмянымі. Гэта тлумачыцца найперш адсутнасцю іх дакладнай атрыбуцыі. Зрэшты, яна ўскладняецца чарнавым характарам выяў і невыразнасцю многіх надпісаў. Так, доўгі час лічылася, што аўтарам гэтых накідаў быў канюшы Вялікага Княства Літоўскага Багуслаў Радзівіл, а самі малюнкі з'яўляюцца праектамі. Аднак вывучэнне выяў і надпісаў на чарнавіках, а таксама паперы, на якой яны былі зроблены, дазволіла вызначыць, што большасць малюнкаў належыць руцэ яго стрыечнага брата гетмана Януша Радзівіла і адлюстроўваюць аб'екты, якія ўжо існавалі. Няма пэўнасці наконт аўтарства шэрагу выяў, напрыклад відаў гарадоў і чыставых чарцяжоў асобных будынкаў. Іх маглі выканаць іншыя людзі, аднак гэта рабілася на замову гетмана, а малюнкі былі ўключаны ў яго асабістую калекцыю.

Вельмі падобныя да мінскага збору па характары выканання і почырку чарнавыя малюнкі захоўваюцца ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы ў Санкт-Пецярбургу[4]. У дзвюх адзінках захавання налічваецца 9 аркушаў, на якіх адлюстраваны 27 казацкіх харугваў, 1 бунчук і 1 дрэўка, захопленыя войскам Вялікага Княства Літоўскага ў 1651 г. Гэтыя малюнкі вядомы даследчыкам з пачатку 1960-х гг. і шырока выкарыстоўваліся ва ўкраінскай гістарычнай літаратуры, але пытанне іх аўтарства доўгі час заставалася нявырашаным. Сувязь гэтай калекцыі з мінскім зборам выглядае вельмі праўдападобнай, а разам яны, па ўсёй верагоднасці, уяўляюць рэшткі калісьці вялікай калекцыі чарнавых замалёвак і запісаў гетмана Януша Радзівіла. Таму ў гэтым выданні было вырашана іх аб'яднаць.

Калекцыя чарнавых малюнкаў Януша Радзівіла з'яўляецца ўнікальным зборам, якому няма блізкіх аналагаў ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне. Маляваннем цікавіліся многія адукаваныя прадстаўнікі вышэйшага саслоўя, аднак да цяперашняга часу ў архівасховішчах не ўдалося выявіць падобнай графічнай калекцыі XVI–XVIII стст.

Чарнавікі з мінскага збору дазваляюць фактычна зазірнуць у свет драўлянай архітэктуры ўсходніх зямель Беларусі і Украіны сярэдзіны XVII ст. Літаральна праз некалькі гадоў пасля стварэння малюнкаў гэты свет незваротна знік у полымі вайны 1654–1667 гг. Робячы замалёўкі, Януш Радзівіл імкнуўся да фіксацыі параметраў аб'ектаў, якія прыцягнулі яго ўвагу, таму ў многіх выпадках маюцца дакладныя архітэктурныя абмеры. Напрыклад, брама Спаскага манастыра ў Слуцку была замалявана з усіх чатырох бакоў, да таго ж быў зроблены план другога паверху. Магнат значна апярэдзіў свой час, бо падобныя абмеры архітэктурных помнікаў на нашых землях сталі масава выконваць толькі ў XIX ст.

У выпадку малюнкаў з мінскага і пецярбургскага збораў маюцца хуткія накіды, зробленыя для прыватнага карыстання і задавальнення ўласнай цікавасці. Таму яны з'яўляюцца своеасаблівым люстэркам, праз якое магчыма пабачыць унутраны свет іх стваральніка – Януша Радзівіла, адной з самых цікавых і супярэчлівых асоб у гісторыі Рэчы Паспалітай XVII ст.

Магнат нарадзіўся 12 снежня 1612 г., і як прадстаўніку біржанскай галіны роду яму была наканавана ваенная служба. Валодаючы вялізнымі зямельнымі ўладаннямі і значным

палітычным уплывам ён здолеў у 1646 г. атрымаць пасаду польнага гетмана ВКЛ. Ваенныя поспехі падчас казацкага паўстання 1648–1653 гг. зрабілі яго першым кандыдатам на пасаду вялікага гетмана, якая вызвалілася ў 1654 г. Нягледзячы на палітычнае супрацьстаянне з каралём Янам ІІ Казімірам, апошні быў вымушаны прызнаць заслугі Радзівіла і надаў яму вышэйшы ваенны ўрад у ВКЛ. Няздольнасць Рэчы Паспалітай вырашыць канфлікт з казакамі прывяла да катастрафічных наступстваў: на баку казакоў выступіла Маскоўская дзяржава, якая ў 1654 г. распачала вайну і за першыя два гады заняла амаль усю тэрыторыю Вялікага Княства. У такіх умовах гетман ініцыяваў разрыў уніі ВКЛ з Польшчай і 20 кастрычніка 1655 г. у Кейданах на чале групы аднадумцаў падпісаў новую унію са Швецыяй. Рэалізаваць гэты знешнепалітычны праект, аднак, не ўдалося, а ўначы з 30 на 31 снежня магнат памёр. Ваенныя і палітычныя няўдачы апошніх гадоў жыцця і ўрэшце трагічны канец сфарміравалі своеасаблівую «чорную легенду» пра Януша Радзівіла, якая для многіх зацямніла вобраз гэтай цікавай і шматграннай асобы.

З упэўненасцю можна сцвярджаць, што малюнкі, якія захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі, былі сабраны ў адну калекцыю яшчэ ў другой палове XVII ст. Пра гэта выразна сведчыць наяўнасць на першым аркушы досыць простай назвы збору – «Abryssy rozne» (бел. «Розныя абрысы»). Гэтае ёмістае, лаканічнае і арыгінальнае вызначэнне, напісанае на мясцовым варыянце польскай мовы, было вырашана вынесці ў загаловак выдання.

Паводле структуры кніга падзяляецца на некалькі частак, галоўнай з іх выступае факсімільная публікацыя саміх малюнкаў. Паколькі мінская калекцыя з'яўляецца фактычна россыпам, складзеным без пэўнага парадку, было прынята рашэнне згрупаваць малюнкі паводле тэматычнага прынцыпу. Пры гэтым мінскі і пецярбургскі зборы былі аб'яднаны. Гэта дазволіла звесці разам выявы асобных аб'ектаў і мясцін, а таксама аб'яднаць іх у тэматычныя групы. Грунтуючыся на абраным парадку размяшчэння накідаў, была ўведзена ўласная нумарацыя. Нумар складаецца з трох частак: першай лічбай абазначаны парадак аркуша ў гэтым выданні (цэлыя разгорнутыя аркушы пазначаны адным нумарам), другой – калекцыя (1 – мінская, 2 – пецярбургская), трэцяй – арыгінальная пагінацыя.

Публікацыі малюнкаў папярэднічае тэкставая частка, якая складаецца з чатырох раздзелаў. У першым разглядаецца гісторыя малюнкаў і іх вывучэнне, у другім – іх знешняя характарыстыка (папера, філіграні, почыркі і характар малявання), у трэцім – тэматыка выяў і асобныя сюжэты. У межах другога і трэцяга раздзелаў фактычна праводзіцца знешняя і ўнутраная крытыка накідаў як гістарычнай крыніцы, што дазваляе вызначыць іх аўтарства, а таксама час і абставіны стварэння асобных замалёвак ці спісаў. У чацвёртым раздзеле на прыкладзе малюнкаў Януша Радзівіла аналізуецца практыка стварэння чарнавых замалёвак як інструмента мыслення ранняга Новага часу, робіцца спроба больш шырокіх абагульненняў з мэтай асэнсавання месца гэтых малюнкаў у кантэксце эпохі. Аўтарамі тэкставай часткі зборніка з'яўляюцца кандыдат гістарычных навук Мікалай Волкаў (прадмова, раздзелы 1–3, высновы, каментарыі, інтынерарый) і гісторык Кірыл Карлюк (раздзел 4, высновы).

Надпісы, якія суправаджаюць выявы ці выступаюць у выглядзе асобных спісаў, у многіх выпадках невыразныя і цяжкія для прачытання. Таму пасля факсіміле малюнкаў змешчаны каментарыі да іх з расчытаннем надпісаў. У дадатку таксама прыведзены ітынерарый, альбо апісанне падарожжаў Януша Радзівіла. Ён не прэтэндуе на паўнату і патрабуе значнай дапрацоўкі, аднак з'яўляецца важным для вывучэння асобных малюнкаў.

Складаная праца па атрыбуцыі малюнкаў і падрыхтоўцы гэтага выдання была б немагчымай без падтрымкі і дапамогі многіх людзей і арганізацый, якім выказваюцца самыя шчырыя словы ўдзячнасці. Дырэктар Дэпартамента па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь **Віктар Кураш**, дырэктар Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі **Дзмітрый Яцэвіч**, намеснік дырэктара **Дзяніс Лісейчыкаў** і загадчык аддзела навукова-даследчай і публікацыйнай дзейнасці **Дзмітрый Матвейчык** падтрымалі ідэю па апрацоўцы і выданні малюнкаў Януша Радзівіла і прыклалі вялікія арганізацыйныя намаганні для рэалізацыі гэтага праекта. Важнай для нашай працы стала падтрымка і парады загадчыка сектара заходнерускіх рукапісных фондаў аддзела рукапісаў Расійскай нацыянальнай бібліятэкі ў Санкт-Пецярбургу **Наталлі Елагінай** і загадчыка трэцяга аддзела Галоўнага архіва старажытных актаў у Варшаве **Яраслава Завадзкага**. Паглыбленае вывучэнне біяграфіі і вайсковай дзейнасці Януша Радзівіла стала магчымым дзякуючы матэрыялам і напрацоўкам, якімі ласкава падзяліліся польскія гісторыкі **Міраслаў Нагельскі**, **Конрад Бабятыньскі**, **Кшыштаф Касажэцкі** і **Пшэмыслаў Гаўрон**. Для працы з арыгіналамі дакументаў Януша Радзівіла дзякуючы падтрымцы **Нямецкага гістарычнага інстытута ў Маскве** была ажыццёўлена навуковая паездка ў Санкт-Пецярбург. Копіі дакументаў гетмана з архіваў Кракава і Берліна для працы зрабілі **Станіслаў Класоўскі** і **Сяргей Палехаў**. За кансультацыі пры вывучэнні малюнкаў таксама хочацца падзякаваць **Аляксею Бацюкову**, **Анджэю Бэтлею**, **Раману Забелу**, **Андрэю Латушкіну**, **Ганне Мажэйка**, **Генадзю Семянчуку** і **Аляксею Якаўлеву**. Урэшце, важнай для паспяховага завяршэння нашай працы стала падтрымка **Мацея Радзівіла** і фонду «Fundacja Trzy Trąby».

---

[1] Dreścik J. J. Kampanie wojsk Wielkiego Księstwa Litewskiego przeciw powstaniu Chmielnickiego w rysunkach Abrahama van Westervelt // Muzealnictwo wojskowe. T. 7. Warszawa, 2000. S. 397–427; Волкаў М. А. Карціны і габелены на батальныя сюжэты XVI–XVIII стст. у аздабленні Нясвіжскага замка // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 14. Мінск, 2016. С. 132–144.

[2] KKPS. DB V 68; Мицик Ю., Березенко Б. Унікальний портрет полковника Мартина Небаби // Сіверянський літопис. 2013. № 4–6. С. 3–4; Березенко Б. Випадкова знахідка // National Geographic. 2013. Грудень. С. 34–35. Створаны па замове сваяка Януша Радзівіла і ўдзельніка кампаній супраць казакоў герцага Франца Эрдмана Саксен-Лаўэнбургскага, герб і абрэвіятура імя і тытула якога (расшыфроўваецца як «*Von Gottes Gnaden Franz Erdmann Herzog Zu Sachsen, Engern Und Westphalen*») змешчаны на тытульным лісце.

[3] НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 287. Арк. 1–41, 43–47.

[4] РНБ. Ф. 971. Авт. 152. № 17, 18.